ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ
Майстрэня беларусістычнай глотадыдактыкі
пры Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта
13 траўня 2021 года
праводзіць

бясплатную навуковую канферэнцыю ў дыстанцыйным рэжыме "Беларусістычная глотадыдактыка – гісторыя, сучасны стан і перспектывы. Да 5-годдзя Майстрэні беларусістычнай глотадыдактыкі"

Праблемнае поле канферэнцыі:

1. Выкладанне беларускай літаратуры замежнікам.
2. Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай – метады выкладання граматыкі, ведаў пра Беларусь; развіццё навыкаў вуснага маўлення, аўдыявання, чытання і пісьма; новыя тэхналогіі на занятках па беларускай мове; азнаямленне з літаратурнымі тэкстамі; выкарыстанне літаратурных тэкстаў у міжнародных, аднанацыянальных групах і ў (не)славянскіх групах і г. д.
3. Мова і культура – пытанні культурнай лінгвістыкі (лінгвакраіназнаўства, лінгвакультуралогія, беларусазнаўства); міжкультурная камунікацыя, выкладанне мовы і культуры Беларусі; месца культуры ў выкладанні мовы; прымаўкі, прыказкі, фразеалогія, безэквівалентная лексіка, маўленчы этыкет; стэрэатыпы ў падручніках, ролі мужчыны і жанчыны; распаўсюджаныя імёны і прозвішчы, рысы характару беларусаў; табуізацыя некаторых тэм, такіх, як эротыка, смерць, рэлігія; ідэалізацыя герояў падручнікаў, іх сям'і і г. д.
4. Праблемы сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай.
5. Беларушчына замежнікаў – аналіз моўных памылак; даследаванне г. зв. пераходнай мовы (анг. *interlanguage*) і вымаўлення.
6. Праблемы адукацыі і працы выкладчыкаў беларускай мовы як замежнай у Беларусі і за мяжой, памылкі лектараў.
7. Параўнальная глотадыдактыка – напр., беларуска-польская, беларуска-расійская, беларуска-нямецкая і г. д.; даследаванне падабенстваў і адрозненняў моў; параўнанне метадаў выкладання, праграм курсаў, моўных цяжкасцяў, ролі выкладчыка і г. д.
8. Гісторыя і сучаснасць выкладання беларускай мовы як замежнай, напр. старыя і новыя падручнікі беларускай мовы як замежнай, спосабы прэзентацыі матэрыялу, тэматычная разнастайнасць.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская і польская.

Просім Вас даслаць заяўку на ўдзел у канферэнцыі на адрас Аргкамітэта да **30 красавіка 2021 года**, а тэкст даклада да **20 траўня 2021 года**. Прадугледжаны ўдзел у канферэнцыі ў фармаце анлайн (Zoom)

Па выніках канферэнцыі запланавана выданне чарговага нумара рэцэнзаванага часопіса „Беларуская мова як замежная" (гл. http://bel.kb.uw.edu.pl/bmz/). У часопіс трапяць тэксты, якія будуць станоўча ацэнены рэцэнзентамі. Удзельнікам часопіс будзе высылацца ў электронным выглядзе (у фармаце .pdf) на ўказаны імі адрас электроннай пошты.

Адказны за канферэнцыю: д.ф.н. Радаслаў Калета, кіраўнік Майстрэні беларусістычнай глотадыдактыкі. E-mail: rkaleta@uw.edu.pl

Патрабаванні да афармлення артыкулаў:

Шрыфт Times New Roman 12, інтэрвал 1,5 (у спасылках памер шрыфта – 10, інтэрвал паміж радкамі – 1,5).

Афармленне артыкула
Імя (не ініцыял) і прозвішча аўтара
Месца працы аўтара (напр. Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт)
Адкрыты ідэнтыфікатар даследчыка і ўдзельніка ORCID (гл. https://orcid.org/)
Адрас электроннай пошты аўтара
Загаловак
Загаловак па-англійску
2 рэзюмэ (па-англійску і па-беларуску) – прыкладна па 500 знакаў
5 ключавых слоў па-беларуску і па-англійску
Асноўны тэкст
Літаратура (ненумараваны алфавітны спіс)

Цытаты падаюцца ў двукоссі (“”) – без курсіву.
Ілюстрацыйны матэрыял вылучаецца курсівам.
Спасылкі на літаратуру змяшчаюцца ў артыкуле ў квадратных дужках, падаем прозвішча аўтара або рэдактара, год выдання і старонку, напр.:
1 аўтар: [Трацяк 2015: 58],
рэдактар: [Барысенка (рэд.) 2015: 54],
Працы аднаго аўтара, выдадзеныя ў адным годзе: [Калета 2015а: 65, 2015б: 120-124],
2 аўтары адной працы: [Барысенка, Калета 2015: 65],
3 аўтары адной працы: [Барысенка, Калета, Трацяк 2015: 65],
шмат аўтараў: [Калета і інш. 2015: 65].

Дапускаюцца аўтаматычна прастаўленыя спасылкі знізу старонкі для дадатковых заўваг і каментароў, але не для звычайных спасылак на літаратуру.
Бібліяграфічны спіс, размяшчаецца ў канцы артыкула ў ненумараваным алфавітным парадку. Кірылічныя і лацінаграфічныя працы нельга падаваць ўперамешку агульным спісам.
Прыклады:

1) **Манаграфія**

Важнік С., 2008, *Кантрастыўны сінтаксіс польскай і беларускай моў. Семантыка і дыстрыбуцыя дзеяслоўнага прэдыката*, Мінск.

2) **Манаграфія пад рэдакцыяй**

Лагвінец А., Чуліцкая Т. (рэд.), 2013, *Беларусь і беларусы сярод суседдзяў: гістарычныя стэрэатыпы і палітычня канструкты*, Варшава.

3) **Раздзел у манаграфіі пад рэдакцыяй**

Лобач У., 2013, *Вобразы суседніх народаў у традыцыйным светапоглядзе беларусаў*, [у:] А. Лагвінец, Т. Чуліцкая (рэд.), *Беларусь і беларусы сярод суседдзяў гістарычныя стэрэатыпы і палітычныя канструкты*, Варшава, с. 39-52.

4) **Артыкул у часопісе**

Калета Р., 2013, *Пра беларуска-польскіх “фальшывых сяброў перакладчыка”*, “Acta Albaruthenica”, т. 13, с. 135-144.